3. *Гужалоўскі, А. А.* Уводзіны / А. А. Гужалоўскі // Музеі Беларусі / рэд. савет: Г. П. Пашкоў, Л. В. Календа, М. Г. Нікіцін. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2008. – С. 3–56.

4. *Казак, А.* Справаздача Цэнтральнага бюро краязнаўства / А. Казак // Наш край. – 1928. – № 5. – С. 55–61.

5. *Мялешка, С.* Полацкі акруговы краязнаўчы музей / С. Мялешка // Наш край. – 1929. – № 12. – С. 55–57.

6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 974. – Воп. 1. – Спр. 46.

7. Праца Калінінскага акруговага таварыства краязнаўства // Наш край. – 1926. – № 10–11. – С. 62–69.

8. Працы першага Усебеларускага краязнаўчага зъезду. 7–11 лютага 1926 г. – Менск, 1926. – 81 с.

9. *Размутова, Т. О.* Краеведческие музеи / Т. О. Размутова, А. И. Фролов // Российская музейная энциклопедия: в 2 т. – Т. 1. – М.: Прогресс, «РИПОЛ КЛАССИК», 2001. – С. 298–301.

10. Рэзалюцыі Ўсебеларускай краязнаўчай канферэнцыі па арганізацыйнаму пытанню і дакладах навуковых установаў // Асьвета. – 1924. – № 3. – С. 169–171.

11. Уд-нік. Камісія Беларусазнаўства ў Слуцку // Савецкая Беларусь. – 1923. – 25 мая. – С. 3.

12. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 15.

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МУЗЕЯЎ: ШЫРЫНЯ ДЫЯПАЗОНУ

***М. А. Бяспалая,***
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Існуе даволі папулярнае вызначэнне музея як месца сустрэчы культуры і адукацыі. Аднак, на наш погляд, у музеі назіраецца выразнае ўзаемадзеянне культуры і навукі, культуры і творчасці. У выніку гэтага шматвектарнага супрацоўніцтва кожны музей паўстае як складаны сацыякультурны арганізм, якому ўласцівы самыя разнастайныя функцыі: ад візуальна-рэпрэзэнтатыўнай да культурна-адукацыйнай.

Генезіс і эвалюцыя музея як сацыякультурнага інстытута адбывалася на працягу тысячагоддзяў. Безумоўна, для гэтага па-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трэбна шмат ўмоў, і адна з галоўных, на думку даследчыкаў, – гэта людзі, якія могуць арыгінальна думать і генерыраваць новыя ідэі, а ў дадатак – духоўнае асяроддзе, якое здольна іх успрымаць, і матэрыяльныя сродкі, якія могуць іх падтрымаць.

Ужо з архаічных часоў чалавек жадаў задаволіць сваю цікавасць да незвычайнага шляхам стварэння пры школах вучэбных сховішч, напрыклад, з рэшткамі клінапісных таблічак, утрымання экзатычных жывёл, птушак, рыбін. Зацікаўленасць да раней невядомага стымулявала даследчую ініцыятыву. Пры школах Платона (Акадэмія) і Арыстоцеля (Лікей) збіраліся калекцыі, вывучэнне і аналіз якіх садзейнічалі выпрацоўцы тэарэтычных высноў. Менавіта пры вучні Арыстоцеля – Тэафрасце за месцам даследавання, навучання і захавання калекцый замацавалася паняцце «мусейён». Найбольш вядомым цэнтрам навуковых даследаванняў эліністычнага свету была егіпецкая Александрыя.

Збіральніцтва ў пэўнай ступені выконвала і патрыятычную ролю. Прадметы, якія мелі дачыненне да гістарычных падзей ці асоб, выстаўляліся ў людных месцах, надзяляліся патрыятычным зместам і былі накіраваны на выхаванне ў гледачоў пачуцця этнічнага адзінства. Мела месца і іншая матывацыя прадмузейнага збіральніцтва, аднак усе яе віды адлюстроўвалі сацыяльны і культурны стан грамадства.

Прадмузейнае збіральніцтва існавала і на старажытных беларускіх землях, што пацвярджае заканамернасць развіцця культуры, калі ў разнастайных грамадствах узнікалі з’явы аднолькавага сацыякультурнага зместу. Калекцыі ўзнікалі там, дзе былі грашовыя сродкі і жаданне калекцыяніраваць. Вядомы спецыяліст музейнай справы ў Беларусі А. Гужалоўскі лічыць адной з асноўных матывацый узнікнення прыватнага збіральніцтва пачуццё прэстыжу, імкненне ўмацаваць свой грамадзянскі статус. Гэтую ролю выконвалі княжацкія скарбніцы, адна з найбагацейшых на ўсходнеславянскіх землях існавала ў Полацку ў XI–XIII стст. Не адмаўляе ўпамянуты аўтар і сакральнай матывацыі збораў прадмузейнага характару. Напрыклад, Еўфрасіння Полацкая набыла абраз Маці Боскай Эфескай, замовіла і фінансава падтрымала выраб знакамітага крыжа.

Новы ўзровень эканамічнага і сацыяльна-культурнага стану грамадства адлюстроўвае скарбніца ВКЛ, якая пачала фарміравацца з часоў Гедыміна. Вялікі князь Аляксандр як высокааду-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каваная асоба цікавіўся мастацтвам і папаўняў скарбніцу не за кошт ваенных трафеяў, а шляхам набыцця новых карцін, скульптур, ювелірных вырабаў, рукапісных кніг. Пасля заключэння ў 1569 г. Люблінскай уніі значэнне скарбніцы ВКЛ падае. Аднак культурная дзейнасць Аляксандра стала аб'ектам падражання для багатых колаў княства. Мікалай Радзівіл «Чорны» залажыў у Нясвіжы калекцыю, якая была найбольш багатай на працягу XVII–XVIII стст. Багаты збор існаваў у Ружанскім замку княжацкага роду Сапегаў і інш.

З узнікненнем публічных музеяў паўстала патрэба ў навуковым асэнсаванні іх дзейнасці. Музеязнаўства, ці, згодна заходнееўрапейскай традыцыі, музеялогія, – навука дастаткова маладая. Упершыню такі тэрмін у адносінах да вывучэння дзейнасці музея быў ужыты ў другой палове XIX ст. З цягам часу вакол гэтага тэрміна і азначанай праблемы разгарнулася актыўная навуковая дыскусія. Асабліва выразная палеміка па пытаннях: што сабою ўяўляе музей і ці можна лічыць музеялогію навукай – пачалася ў другой палове XIX ст. У ёй вызначыліся прадстаўнікі славацкай і чэшскай школ музеялогіі, навуковыя распрацоўкі якіх адлюстроўвалі эвалюцыю навуковых поглядаў на музей і яго дзейнасць.

У выніку вучоныя-музеёлагі выпрацавалі навуковы падыход да музея як да сацыяльна-культурнага інстытута, які займае сваю нішу ў сацыяльным асяроддзі і выконвае культурныя і адукацыйныя функцыі спецыфічнымі, уласцівымі толькі яму метадамі. У сваю чаргу апошнія таксама былі ахоплены ўсебаковым вывучэннем, і сярод традыцыйна музейных функцый – дакументавання, захавання, трансляцыі – сучаснымі музеёлагамі выдзяляюцца новыя, якія адпавядаюць цяперашняй сітуацыі: камунікатыўная, псіхолага-педагагічная і інш.

Аднак і на сучасным этапе развіцця музеязнаўства існуе шмат дыскусійных пытанняў і адно з іх – роля навукова-даследчай дзейнасці музеяў. Як тэарэтыкі, так і практыкі музейнай справы прызнаюць, што гэты кірунак з'яўляецца фундаментам усіх відаў жыццядзейнасці музея. Дыскусію выклікае пытанне аб суадносінах навукова-даследчай і астатніх кірункаў дзейнасці музея. Прадметам дыскусіі можна лічыць такую пастаноўку пытання: ці могуць музеі захоўваць статус навуковай установы і пры гэтым звяртацца да масавай аўдыторыі? Ці можна рацыянальна збалансаваць навуковы і відовішчны ас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пекты? У такім падыходзе, падаецца, адчуваецца традыцыйнасць поглядаў на музей як, у першую чаргу, навуковую ўстанову. Гэта было характэрна для XIX – пачатку XX ст., калі адбывалася станаўленне тэорыі музейнай справы і выдзяленне ў ёй такога кірунку, як навукова-даследчая дзейнасць.

Эвалюцыя музейнай справы дазволіла музеёлагам вызначыць два асноўныя кірункі навукова-даследчай дзейнасці, якія прызнаюцца ўсімі даследчыкамі: музеязнаўчы і ў рэчышчы профільных навук. Першы з іх падзяляецца на такія сегменты, як навуковае камплектаванне фондаў, навуковыя даследаванні ў галіне захавання музейных прадметаў, комплексныя даследаванні пры стварэнні экспазіцый і выстаў і інш. Распрацоўка прынцыпаў культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў грунтуецца на навукова-метадычных распрацоўках педагогікі, псіхалогіі, сацыялогіі і інш.

Другі кірунак навукова-даследчай дзейнасці музеяў звязаны з профільнымі навукамі, у праблемным полі якіх працуе музей, а музейныя калекцыі складаюць іх крыніцазнаўчую базу. Нельга не прызнаць, што гэты напрамак навукова-даследчай дзейнасці для музея вельмі маштабны і складаны, таму што патрабуе высокакваліфікаваных кадраў, якія маюць здольнасць і выразную матывацыю да навукова-даследчай работы. Пра гэта сведчаць цікавыя даследаванні, выкананыя на аснове музейных калекцый, напрыклад, у гістарычнай навуцы. Зразумела, яны не ахопліваюць значных праблемных пытанняў профільнай навукі і прысвечаны ў асноўным некаторым аспектам сацыякультурнага жыцця. Да найбольш цікавых у гэтым плане можна аднесці работу Т. А. Карповіч «Культурнае жыццё Мінска першай паловы XIX ст.» (Мінск, 2007). У даследаванні праявілася багатая музейная практыка аўтара, якая і дапамагла аб'яднаць патрабаванні да музейнай экспазіцыі і навуковай публікацыі, у першую чаргу іх даступнасць і зразумеласць.

Знакавым для нашай краіны з'яўляецца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Супрацоўнікі музея сабралі, навукова апісалі каля 140 тыс. музейных прадметаў, многія з якіх прадстаўляюць асобныя каштоўныя калекцыі, напрыклад, рукапісных партызанскіх часопісаў, самаробнай партызанскай зброі, мастацкіх твораў і інш.

Навуковыя даследаванні ў музеі вяліся і вядуцца ў межах гісторыі Вялікай Айчыннай вайны праз пошук, аналіз, распаў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сюджванне і ўвядзенне ў навуковы зварот новых фактаў і публікацыю артыкулаў у энцыклапедыях, навуковых зборніках, навукова-папулярныя публікацыі ў перыядычным друку, выступленні на навуковых канферэнцыях. Як адно з самых інфарматыўных і прадуманых выданняў можна разглядаць невялічкую брашуру А. Г. Ванькові́ч «Экскурсія ў Трасцянец», у якой распавядаецца аб лагеры смерці Малы Трасцянец, дзе было знішчана 206 500 чалавек і які дзейнічаў недалёка ад Мінска з канца 1941 г. да лета 1944 г. Аўтар адшукала і змясціла ў брашуры здымкі некаторых ахвяр, назвала прозвішчы многіх злачынцаў. За гэтай маленькай брашурай стаіць велізарная шматгадовая навукова-пошукавая праца аўтара.

Перамены 1990-х гг. у сацыякультурным жыцці рэспублікі выклікалі інтарэс да малавядомых старонак Вялікай Айчыннай вайны. Навуковыя супрацоўнікі музея друкуюць артыкулы самай разнастайнай тэматыкі, напрыклад «Ваенныя грошы Другой сусветнай вайны ў музейнай калекцыі баністыкі», «Гісторыя Першага і Другога Беларускіх драматычных тэатраў у дакументах музейных фондаў», «Дзіцячыя дамы Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» і інш.

Адна з самых вядомых і ўнікальных калекцый музея гісторыі Вялікай Айчынай вайны – калекцыя рукапісных партызанскіх часопісаў. Яна налічвае 248 адзінак і складаецца з рукапісных выданняў партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі. Партызанскія рукапісныя часопісы ўжо выступалі ў якасці крыніцазнаўчай базы для даследавання беларускіх гісторыкаў. На іх аснове напісаны манаграфіі Г. Д. Кнацько, І. С. Краўчанка, Л. Мухарынскай. Мастацкае афармленне часопісаў таксама стала адным з аб’ектаў вывучэння ў манаграфіі і доктарскай дысертацыі Р. Ф. Шаура. Навуковая ацэнка калекцый з’яўляецца выразным доказам таго, што кожны новы перыяд у гісторыі грамадства прадугледжвае свае падыходы да ацэнкі гістарычных падзей, вывучэння пунктаў гледжання, адпавядаючых часу, да фармулёўкі новых мэт і задач.

А вось пытанне аб навуковых даследаваннях па тэорыі музеялогіі застаецца невырашаным. Відавочна, што значных работ па тэорыі музейнай справы ў Беларусі пакуль-што не з’явілася. Аднак, на наш погляд, своеасаблівае месца ў гэтым кірунку навукова-даследчай дзейнасці належыць навукова-метадыч-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най рабоце. Яна прадугледжвае сістэматызацыю экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці, аналіз накопленага вопыту і відавочных памылак. Такая аналітычная праца патрабуе адпаведнага прафесіяналізму. Першыя метадычныя распрацоўкі выкарыстоўваліся ў саміх музеях, але па меры назапашвання метадычны вопыт стаў распаўсюджвацца на іншыя профільныя музеі.

Такім чынам, прыведзены вышэй кароткі агляд навукова-даследчай дзейнасці музеяў Рэспублікі Беларусь адлюстроўвае шырыню дыяпазона гэтага кірунку дзейнасці музея. Асноўныя дасягненні ў гэтым кірунку звязаны з профільнай навукай. Увядзенне ў шырокі зварот вынікаў даследавання: ад выдання манаграфіі, каталогаў, зборнікаў да стварэння экспазіцый і выстаў – характэрна для кожнага музея. Праблемнымі для айчыннай музеязнаўчай навукі з’яўляюцца даследаванні ў галіне тэарэтычнага музеязнаўства.

## КУЛЬТУРНЫ ТУРЫЗМ ЯК СРОДАК ЗАХАВАННЯ І ВЫКАРЫСТАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

***Д. В. Герасімёнак,***
*аспірант, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

У апошнія гады сярод іншых відаў турызму (аздараўленчы, дзелавы, спартыўны і інш.) культурны турызм стаў займаць усё больш прыкметнае месца ў эканамічнай, сацыяльнай і ў асаблівасці духоўнай сферы сучаснага грамадства. Ён прадэманстраваў значныя тэмпы росту і маштабы ўплыву на ўзровень і накіраванасць развіцця сусветнай супольнасці. Паводле ацэнкі Сусветнай турысцкай арганізацыі (СТА) на культурны турызм у 2006 г. прыходзілася больш за 40 % усіх падарожжаў, што робіць яго адным з найбольш папулярных відаў турыстычнай дзейнасці [3, с. 185]. Узрастанне значэння культурнага турызму ў жыцці кожнай краіны на сучасным этапе сацыякультурнага развіцця абумоўлена працэсамі глабалізацыі і інтэрнацыяналізацыі, якія негатыўна адбіваюцца на захаванні лакальнай культуры соцыуму. Менавіта дадзены від турызму здольны вы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ